**© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»**

**УВАГА!** *Фатаграфаванне, капіраванне і распаўсюджванне тэставага матэрыялу цягне за сабой адміністрацыйную адказнасць.*

## РТ–2025/2026 гг. Этап I

## Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі

## Варыянт 2

*Варыянт змяшчае* 38 *заданняў і складаецца з часткі* А (16 *заданняў) і часткі* В (22 *заданні). На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца* 90 *мінут. Будзьце ўважлівыя! Жадаем поспеху!*

### Частка А

*У кожным заданні часткі* А *толькі адзін з прапанаваных адказаў з'яўляецца правільным. У бланку адказаў пад нумарам задання пастаўце метку (×) у клетачцы, якая адпавядае нумару выбранага Вамі адказу.*

**А1. Пакланенне неадушаўлёным прадметам, якім прыпісваюць звышнатуральныя ўласцівасці, атрымала назву:**
1) анімізм;
2) фетышызм;
3) татэмізм;
4) магія;
5) язычніцтва.

**А2. Суседская абшчына ва ўсходніх славян называлася:**
1) кагал;
2) дым;
3) валока;
4) талака;
5) верв.

**А3. Першым з манахаў, хто здзейсніў подзвіг стоўпніцтва, стаў беларускі асветнік і прапаведнік:**
1) Клімент Смаляціч;
2) Сымон Будны;
3) Кірыла Тураўскі;
4) Лазар Богша;
5) Васіль Цяпінскі.

**А4. Вызначце правільнае сцверджанне адносна палітычнага развіцця еўрапейскіх цывілізацый у Познім сярэднявеччы.**
1) У XIV ст. многія гарады пачалі барацьбу за атрыманне права на самакіраванне.
2) У канцы XV – пачатку XVI ст. на палітычнай карце Еўропы з'явілася новая дзяржава – Расія.
3) У канцы XIV ст. абвастрыліся супярэчнасці паміж еўрапейскімі дзяржавамі ў іх барацьбе за калоніі.
4) Франкская імперыя ў XIV ст. падзялілася на тры дзяржавы.
5) Еўрапейскія дзяржавы Позняга сярэднявечча перажывалі перыяд феадальнай раздробленасці.

**А5. Галоўным заканадаўчым органам Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у першай палове XVI ст. становіцца:**
1) сойм;
2) дума;
3) вялікакняжацкая рада;
4) дзяржаўны савет;
5) сенат.

**А6. У XIV–XV стст. у беларускай літаратуры ўзнік новы жанр:**
1) жыціі святых;
2) павучэнні;
3) палітычная сатыра;
4) паломніцкая літаратура;
5) дыярыушы.

**А7. У другой палове XVI – першай палове XVII ст. на тэрыторыі ВКЛ купцы аб'ядноўваліся ў:**
1) юрыдыкі;
2) гільдыі;
3) канфедэрацыі;
4) ордэны;
5) цэхі.

**А8. Адной з галоўных прычын пачатку Рэфармацыі ў Еўропе з'яўляецца:**
1) крызіс маралі і карупцыя ўнутры каталіцкай царквы;
2) развіццё сусветнага гандлю;
3) пашырэнне кантактаў з Новым Светам;
4) развіццё мануфактурнай вытворчасці;
5) узнікненне рэспублік у Еўропе.

**А9. Прачытайце вытрымку з Канстытуцыі 3 мая 1791 г.**

«Усякая ўлада ў чалавечым грамадстве бярэ свой пачатак з волі народа. І каб цэласнасць дзяржавы, свабода грамадзян і грамадскі парадак заставаліся назаўсёды ў раўнавазе, урад народа польскага павінен складацца, і воляю сапраўднага закона заўсёды будзе складацца, з трох улад, г. зн. заканадаўчай улады ў (руках) аб'яднаных саслоўяў, вышэйшай выканаўчай улады ў (руках) караля і варты (міністраў), улады судовай у юрысдыкцыйных (органаў), якія ўсталяваны для гэтай мэты або якія маюць быць усталяваны. Сойм або аб'яднаныя саслоўі будуць дзяліцца на дзве палаты: на палату паслоў і палату сенатараў пад старшынствам караля. Палата паслоў, як адлюстраванне і ўвасабленне ўсеўладдзя народа, будзе святыняй заканадаўства».

**Выкарыстоўваючы вытрымку, вызначце правільнае сцверджанне.**
1) Канстытуцыя пацвердзіла існуючы дзяржаўны лад у Рэчы Паспалітай.
2) Усемагутнасць магнатаў у Рэчы Паспалітай замянялася дэмакратычнымі прынцыпамі канстытуцыйнай манархіі.
3) Распрацоўкай законаў займаліся члены магістратаў.
4) Згодна з Канстытуцыяй у Рэчы Паспалітай пашырыліся правы шляхты.
5) Прыняцце Канстытуцыі азначала пераход ад манархіі да рэспублікі.

**A10. Адным з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы быў:**
1) К. Каліноўскі;
2) Ф. Савіч;
3) М. Рукевіч;
4) Я. Чачот;
5) А. Чартарыйскі.

**A11. Падчас рэформы П. Д. Кісялёва дакумент, які ўключаў апісанне памераў сялянскіх надзелаў і павіннасцей у памешчыцкай вёсцы, называўся:**
1) люстрацыя;
2) спіс;
3) інвентар;
4) рэестр;
5) пералік.

**A12. Вызначце правільнае сцверджанне адносна тэндэнцый гістарычнага развіцця заходнееўрапейскіх дзяржаў у XIX – пачатку XX ст.**
1) На тэрыторыі Еўропы ствараліся варварскія каралеўствы.
2) На змену цэхам у заходнееўрапейскіх гарадах прыйшла мануфактурная вытворчасць.
3) Еўрапейскія дзяржавы перажывалі феадальную раздробленасць.
4) Фарміравалася індустрыяльнае грамадства.
5) У Англіі пачала складвацца сістэма абмежаванай манархіі.

**A13. Адным з мерапрыемстваў палітыкі «ваеннага камунізму» з'яўляецца:**
1) замена харчразвёрсткі харчовым падаткам;
2) дазвол на арэнду зямлі;
3) дазвол на свабодны гандаль;
4) аднаўленне грашовых адносін;
5) увядзенне размеркавання прадуктаў па картках.

**A14. Танкавыя злучэнні нямецкай групы армій «Цэнтр» захапілі Мінск:**
1) 22 чэрвеня 1941 г.;
2) 25 чэрвеня 1941 г.;
3) 28 чэрвеня 1941 г.;
4) 28 ліпеня 1941 г.;
5) 28 жніўня 1941 г.

**A15. Вызначце характэрную рысу сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.:**
1) пераход на інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі;
2) развіццё прыватнага прадпрымальніцтва;
3) правядзенне прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў;
4) пераход да рыначнай эканомікі;
5) павелічэнне долі машынабудавання, металаапрацоўкі і электраэнергетыкі.

**А16. Вызначце адзін з вынікаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў другой палове XX ст.:**
1) павелічэнне колькасці гарадоў;
2) ліквідацыя беспрацоўя;
3) узнікненне ваенна-прамысловага комплексу;
4) рост экалагічных праблем;
5) з'яўленне фабрык і заводаў.

## Частка В

*Адказы, атрыманыя пры выкананні заданняў часткі* В, *запішыце ў бланку адказаў. Кожную літару, лічбу пішыце ў асобнай клетачцы (пачынаючы з першай) па ўзорах, пазначаных у бланку. Адказ у выглядзе слова, некалькіх слоў пішыце без прабелаў, злучка або іншых раздзяляльных знакаў.*

**В1. Устанавіце адпаведнасць.**

| Прычына | Вынік |
|---|---|
| А) развіццё гандлю<br>Б) працаёмкасць здабывання ежы<br>В) выкарыстанне бронзавых прылад працы<br>Г) вычарпанне рэсурсаў населенай мясцовасці | 1) з'яўленне шахтаў па здабычы крэменю<br>2) павелічэнне колькасці насельніцтва<br>3) масавыя перасяленні людзей на новыя тэрыторыі<br>4) жыццё радавымі абшчынамі<br>5) стварэнне алфавітнай пісьменнасці |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В2. Устанавіце адпаведнасць.**

| Дата | Падзея |
|---|---|
| А) 1005 г.<br>Б) 1044 г.<br>В) 1203 г.<br>Г) 1240 г. | 1) пачатак княжання Усяслава Брачыславіча ў Полацку<br>2) пачатак мангольскага нашэсця на Русь<br>3) разгром шведскіх рыцараў на р. Няве<br>4) пачатак супрацьстаяння Полацкага княства з крыжакамі<br>5) стварэнне Тураўскай епархіі |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В3. Вызначце тэндэнцыі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і духоўнага развіцця цывілізацый Еўропы і Азіі ў Раннім і Высокім сярэднявеччы:**
1) пачатак кнігадрукавання;
2) з'яўленне феадальнай раздробленасці;
3) ператварэнне хрысціянства ў вядучую рэлігію ў Еўропе;
4) стварэнне варварскіх каралеўстваў;
5) пераход ад радавой абшчыны да суседскай.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**В4. Вызначце характэрныя рысы развіцця культуры беларускіх зямель у IX–XIII стст.:**
1) бытавое пісьменства на васковых таблічках і бяросце;
2) актыўнае будаўніцтва замкаў;
3) з’яўленне манументальнай скульптуры;
4) фрэскавы роспіс цэркваў і сабораў;
5) фарміраванне мясцовых архітэктурных школ.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**В5. Устанавіце адпаведнасць.**

| Падзея | Гістарычная асоба |
|---|---|
| А) эканамічная рэформа ў каралеўскіх эканоміях 1765 г.<br>Б) казацкае паўстанне 1595–1596 гг.<br>В) заснаванне першых мануфактур на тэрыторыі Беларусі<br>Г) падрыхтоўка Статута ВКЛ 1588 г. | 1) Л. Сапега<br>2) А. Тызенгаўз<br>3) М. Ф. Чартарыйскі<br>4) Г. К. Радзівіл<br>5) С. Налівайка |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б4В3Г5.**

**В6.** Феадальная гаспадарка ў ВКЛ, якая мела таварны характар і была заснавана на працы залежных сялян, атрымала назву «__________».

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В7. Вызначце характэрныя рысы развіцця рамяства і гандлю ў ВКЛ у XIV–XV стст.:**
1) галоўнымі формамі арганізацыі ўнутранага гандлю з’яўляліся кірмашы і таргі;
2) асноўную прадукцыю выраблялі мануфактуры;
3) развіццю знешняга гандлю спрыяла будаўніцтва каналаў;
4) большая частка рамеснікаў працавала па заказах спажыўцоў;
5) гандаль ажыццяўляўся па буйных рэках і сухапутных шляхах.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**В8.** Заканадаўчы акт у ВКЛ, якім вялікія князі давалі або пацвярджалі асаблівыя правы пэўных груп насельніцтва, – **гэта** _________.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**В9. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.:**
1) увядзенне адзінай мытнай пошліны («генеральнай»);
2) вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці;
3) надзяленне сялян дадатковай («прыёмнай») да асноўнага надзелу зямлёй;
4) ажыццяўленне аграрнай рэформы – «валочнай памеры»;
5) наданне шляхце права на мяшчанскія заняткі.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **123.**

**B10. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў XIII–XVIII стст.**
1) Заканчэнне Паўночнай вайны паміж Швецыяй і Паўночным саюзам;
2) бітва на р. Сінія Воды;
3) пачатак Трыццацігадовай вайны ў Еўропе;
4) прыняцце II Статута ВКЛ;
5) бітва пад Вількамірам.

*Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* **12345.**

**B11. Вызначце характэрныя рысы капіталізму:**
1) прымяненне ручной працы;
2) панаванне таварнай гаспадаркі;
3) імкненне да прыбытку;
4) уласнасць на зямлю – аснова грамадскіх адносін;
5) шырокі грамадскі падзел працы.

*Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* **123.**

**B12. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Характарыстыка |
|---|---|
| А) М. Пачобут-Адляніцкі<br>Б) К. Семяновіч<br>В) М. Фарадэй<br>Г) Ч. Дарвін | 1) упершыню ў Еўропе сістэматызаваў і апісаў прылады і апараты ў галіне артылерыі ў працы «Вялікае мастацтва артылерыі»<br>2) англійскі вучоны, аўтар кнігі «Паходжанне відаў»<br>3) вучоны-прыродазнаўца, дырэктар Віленскай абсерваторыі, рэктар Галоўнай школы ВКЛ<br>4) нямецкі фізік, стваральнік тэорыі адноснасці<br>5) стваральнік першай мадэлі электрарухавіка |

*Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:* **А1Б4В3Г5.**

**B13.** Працэс усебаковага збліжэння розных краін і станаўлення адзінай сістэмы тэхналагічных, фінансавых, эканамічных, сацыяльна-палітычных і культурных сувязей на аснове найноўшых інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій – **гэта** ____________.

*Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.*

**B14. Адзначце дату *(год)* падзеі, якая адбылася *апошняй* сярод пералічаных:**
1) аб’яднанне нямецкіх дзяржаў у Германскую імперыю;
2) пачатак Першай сусветнай вайны;
3) Венскі кангрэс;
4) Полацкі царкоўны сабор;
5) стварэнне суполкі «Гоман» у Пецярбургу.

*Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* **1900.**

**B15. Выкарыстоўваючы картасхему «Айчынная вайна 1812 г. на тэрыторыі Беларусі», вызначце правільныя сцверджанні.**




1) Войскамі 1-й заходняй арміі камандаваў П. І. Баграціён.
2) Абарона Бабруйска адбывалася ў жніўні – верасні 1812 г.
3) Пад Віцебскам аб’ядналіся 1-я і 2-я заходнія арміі.
4) У раёне Гродна разгарнулася магутнае сялянскае супраціўленне.
5) У бітве пад Клясціцамі ўдзельнічалі войскі 1-й заходняй арміі.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:*** **12.**

**B16. Устанавіце адпаведнасць.**

| Гістарычная асоба | Характарыстыка |
|---|---|
| А) Я. Карскі<br>Б) М. Баброўскі<br>В) І. Насовіч | 1) прафесар Віленскага ўніверсітэта, зрабіў даступнымі для даследчыкаў шэраг важных пісьмовых помнікаў, у тым ліку кнігі Ф. Скарыны<br>2) у артыкуле «Аб беларускай гаворцы» падкрэсліў адрозненне беларускай мовы ад іншых славянскіх моў<br>3) аўтар даследавання «Беларусы», у якім навукова абгрунтаваў наяўнасць этнічнай самасвядомасці беларусаў<br>4) аўтар-укладальнік першага фундаментальнага «Слоўніка беларускай гаворкі» |

***Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца. Напрыклад:*** **А1Б3В4.**

**B17.** Італія стала першай краінай, у якой фашысты прыйшлі да ўлады **ў______ годзе**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* 1900.**

**B18. Вызначце характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.:**
1) правядзенне палітыкі беларусізацыі;
2) правядзенне пацыфікацый;
3) адсутнасць арганізаванага нацыянальна-вызваленчага руху;
4) развіццё дрэваапрацоўчай прамысловасці;
5) стварэнне машынна-трактарных станцый (МТС).

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 12.**

**B19.** Ідэалогія і палітыка актыўнага нарошчвання і выкарыстання ваеннай магутнасці дзяржавы; дамінаванне ваенных у дзяржаўным і грамадскім жыцці – **гэта ___________**.

***Адказ запішыце словам у форме назоўнага склону.***

**B20. Вызначце характэрныя рысы грамадска-палітычнага жыцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг.:**
1) правядзенне выбараў на альтэрнатыўнай аснове;
2) актывізацыя працэсу рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій;
3) узмацненне дзяржаўнага кантролю над царквою;
4) пашырэнне правоў рэспубліканскай партыйнай арганізацыі;
5) правядзенне рэспубліканскіх рэферэндумаў.

***Адказ запішыце лічбамі (парадак запісу лічбаў не мае значэння). Напрыклад:* 123.**

**B21.** Дагавор аб заснаванні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) быў падпісаны ў Астане **ў _____ годзе**.

***Адказ запішыце ў выглядзе чатырохзначнага ліку. Напрыклад:* 1900.**

**B22. Устанавіце паслядоўнасць падзей, якія адбыліся ў другой палове XX – першай чвэрці XXI ст.**
1) Першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;
2) спыненне Вялікабрытаніяй членства ў Еўрапейскім саюзе (ЕС);
3) стварэнне Еўрапейскага аб’яднання вугалю і сталі (ЕАВС);
4) увядзенне ў строй першага Салігорскага калійнага камбіната.

***Адказ запішыце лічбамі. Напрыклад:* 1234.**